Гушчынская Л.Г., магістрант
БДУКМ
Навуковы кіраўнік – Зыгмантовіч С.В.,
кандыдат педагагічных навук, дацэнт

# ДА ВЫВУЧЭННЯ АСАБЛІВАСЦЕЙ ФАРМІРАВАННЯ ІНФАРМАЦЫЙНЫХ РЭСУРСАЎ СФЕРЫ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На сучасным этапе інфармацыя становіцца асноўным стратэгічным рэсурсам і галоўным кампанентам інфармацыйнага грамадства, які вызначае ступень яго культурнага, інтэлектуальнага і сацыяльна-эканамічнага развіцця, а вытворчасць і спажыванне інфармацыі на аснове новых інфармацыйных тэхналогій становяцца важнейшымі відамі дзейнасці.

Пад уздзеяннем развіцця інфармацыйных тэхналогій трансфармуецца відавы і змястоўны склад інфармацыйных рэсурсаў, тэхналогія іх фарміравання і арганізацыя інфармацыйнага абслугоўвання карыстальнікаў. Асаблівую значнасць набываюць галіновыя інфармацыйныя рэсурсы, у тым ліку сацыягуманітарнай тэматыкі, якія арганічна ўваходзяць у склад нацыянальных інфармацыйных рэсурсаў і спрыяюць захаванню гісторыка-культурнай памяці народа. Цывілізаванасць грамадства, адукацыйны, культурны і маральна-этычны ўзровень свядомасці людзей вызначаюцца перш за ўсё ступенню развітасці гуманітарных навук, сярод якіх прыярытэтнае значэнне набывае сфера культуры.

На сённяшні дзень існуе вялікая колькасць навуковых работ, якія датычацца праблемы інфармацыйных рэсурсаў. Але нягледзячы на гэта, пытанні даследавання інфармацыйных рэсурсаў сферы культуры застаюцца актуальнымі. Пры гэтым вельмі важнымі застаюцца праблемы па выяўленню спецыфікі і марфалогіі інфармацыйных рэсурсаў сферы культуры. Даследаванні ў галіне культуры займаюць значнае месца ў навуковай і практычнай інфармацыйнай дзейнасці, узрастае іх значэнне ў аптымізацыі арганізацыі і кіраванні сацыяльна-культурнай сферы.

Сама культура ўсведамляецца не толькі як галіна сацыяльнай практыкі, але і як сутнастнае якаснае змяненне ўсіх бакоў чалавека і грамадства. Па меркаванні шматлікіх культуролагаў, сучасны свет паступова пачынае адыходзіць ад асветніцкай мадэлі культуры, уласцівай XIX ст., усё менш успрымае культуру, як свята, што было ўласціва XX ст., а ўсё больш ўсведамляецца асноватворным працэсам сацыяльна-эканамічнага развіцця грамадства.

Якаснае фарміраванне інфармацыйных рэсурсаў (ІР) з’яўляецца неабходнай умовай для актыўнага развіцця навуковага, тэхналагічнага і культурнага патэнцыялу нацыі. На сучасным этапе ў нашай краіне сфарміравалася сістэма сацыяльных інстытутаў, дзейнасць якіх накіравана на стварэнне, накапленне і выкарыстанне інфармацыйных рэсурсаў сферы культуры. У першую чаргу гэта такія арганізацыйна афармленыя сацыяльныя інстытуты, як бібліятэкі, архівы, музеі, інфармацыйныя цэнтры, сродкі массавай інфармацыі, выдавецкія і кнігагандлёвыя арганізацыі, якія выконваюць спецыфічныя, уласцівыя толькі ім функцыі, працуюць з дакументнымі массівамі і накіраваны на задавальненне інфармацыйных патрэбнасцей грамадства, а таксама асобных сацыяльных груп і індывідыўмаў.

Сярод вядучых установаў нашай краіны, асаблівая роля ў інфармацыйным забеспячэнні спецыялістаў сферы культуры належыць Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі (НББ). Як рэспубліканскі інфармацыйны і сацыякультурны цэнтр краіны НББ заўсёды надавала значную ўвагу палітыцы стварэння ІР у інтарэсах нацыянальнай культуры і мастацтва.

Адным з найбольш значных рэсурсаў па культуры і мастацтву з’яўляецца бібліяграфічная **БД “Культура і мастацтва Беларусі”.** Аб’ём яе складае больш за 100 тыс. бібліяграфічных запісаў (БЗ). Па тэматычнаму дыапазону – гэта максімальна поўнае адлюстраванне публікацый па ўсіх відах мастацтва і культурнай практыцы: агульныя пытанні культуры, культуралогіі, культурнай палітыкі; сацыякультурная дзейнасць у сферы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

арганізацыі дасуга і народная творчасць; бібліятэчная справа і бібліяграфія; музейная справа і ахова помнікаў культуры і мастацтва; выяўленчае, музычнае, тэатральнае і кінамастацтва, харэаграфія, эстрада, цырк і. г.д.

БД "Культура і мастацтва Беларусі" ўключае БЗ на кнігі, брашуры, навуковыя сборнікі, аўтарэфераты дысертацый, дысертацыі, артыкулы са зборнікаў, часопісаў і газет незалежна ад мовы выданняў па ўсіх вышэйпералічаным напрамках культурнага жыцця краіны, якія паступілі ў фонды НББ. Храналагічны ахват – перыяд з 1993 па 2007 гг. Асноўны масіў БД складаюць аналітычныя бібліяграфічныя запісы (БЗ) (артыкулы са зборнікаў, серыяльных выданняў і выданняў якія працягваюцца, часопісаў, рэспубліканскіх дзяржаўных і недзяржаўных газет, абласных, гарадскіх, часткова раённых).

З укараненнем новай АБІС у 2007 г. БД "Культура і мастацтва Беларусі" была закансервавана і інтэгравана ў політэматычную **БД "Беларусь: ад мінулага да сучаснага".** З гэтага часу бягучы нацыянальны дакументны паток па гуманітарных навуках знаходзіць сваё адлюстраванне ў гэтай БД, дзе дастаткова поўна прадстаўлена інфармацыя аб дакументах па культуры, мастацтве, бібліятэчнай справе і г.д. БД уключае БЗ на дакументы, якія цалкам ці часткова звязаны па змесце з Беларуссю, незалежна ад аўтара, мовы, месца і віда выдання, носьбітаў інфармацыі. БЗ часткова маюць спасылкі на поўныя тэксты дакументаў.

Актуалізацыя БД "Беларусь: ад мінулага да сучаснага" адбываецца штодзённа. На 01.04.2012 яе аб'ём складае звыш 80 тыс. БЗ. Агульная колькасць дакументаў па культуры і мастацтву складае каля 17 тыс. БЗ.
Часткай політэматычнай БД "Беларусь: ад мінулага да сучаснага" з'яўляецца поўнатэкставая **БД "Нацыянальная бібліятэка Беларусі ў друку"** (БД "НББ у друку"). БД "НББ у друку" змяшчае шматлікія выданні НББ, публікацыі супрацоўнікаў, матэрыялы аб дзейнасці НББ, змешчаныя ў перыядычным друку і г.д. БД "НББ у друку" з'яўляецца своеасаблівым архівам дакументаў НББ, публікацый яе супрацоўнікаў. Адлюстроўвае

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гістарычны вопыт развіцця бібліятэчнай справы ў краіне, з’яўляецца крыніцазнаўчай базай, вельмі значнай для навукова-даследчай работы ў галіне бібліятэказнаўства, накіравана на папулярызацыю дасягненняў бібліятэчнай тэорыі і практыкі, павышэння прэстыжу прафессіі бібліятэкара. Храналагічны дыяпазон БД “НББ у друку” : 1922 г. – па наступны час. На бягучы момант БД налічвае больш за 5 тыс. БЗ. З іх каля 4 тыс. маюць спасылкі на поўныя тэксты.

Значны масіў інфармацыі па культуры таксама ўключаюць такія БД НББ як беларусазнаўчая фактаграфічная **“Беларусь у асобах і падзеях”, “Вучоныя Беларусі”, “Нацыянальная БД аўтарытэтных запісаў”**.

Выкарыстанне сучасных мультымедыйных тэхналогій дазволіла не толькі перайсці да выпуску высокаякаснай электроннай прадукцыі, значна павялічыць яе інфармацыйную ёмістасць, камбінаваць бібліяграфічную, фактаграфічную, графічную, аудыё і відыа- інфармацыю, ствараць для карыстальніка аптымальна зручны інфармацыйна-пошукавы рэжым, але і пашырыць рэпертуар інфармацыйнай прадукцыі.

Важным кірункам у выдавецкай дзейнасці Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (НББ) стаў выпуск электронных мультымедыйных рэсурсаў, накіраваных на захаванне і папулярызацыю нацыянальнай культурнай і літаратурнай спадчыны.

Адным з першых электронных літаратурных праектаў стаў выпуск. CD-ROMа ***«Літаратурная спадчына Беларусі, XI – сярэдзіна XX стагоддзя»: з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі»***, у які ўвайшло каля 1400 электронных копій рукапісных, старадрукаваных і сучасных твораў беларускіх аўтараў; пазней пабачылі свет CD-ROM “Электронная бібліятэка – школьнікам” і CD-ROM “Беларуская і руская літаратура. У дапамогу навучэнцам”.

Асобнае месца займаюць мультымедыйныя праекты, прысвечаныя выбітным дзеячам і знамянальным падзеям беларускай гісторыі і культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Так у 2007 г. да 200-годдзя з дня нараджэнння Напалеона Орды (1807–1883) – беларускага мастака, кампазітара, педагога, грамадскага дзеяча, быў выдадзены CD-ROM “Спадчына Напалеона Орды: з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі”

У 2008 і 2009 гг. пабачылі свет яшчэ два мультымедыйныя праекты, прысвечаныя класікам беларускай літаратуры: «Жыве паміж намі дудар наш»: да 200-годдзя з дня нараджэння Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча (1808–1884)» і «Не пакідайце ж мовы нашай беларускай»: да 170-годдзя з дня нараджэння Францішка Багушэвіча (1840–1900)».

У 2011 г. Нацыянальная бібліятэка Беларусі (НББ) падрыхтавала электроннае выданне «Паэт красы і гармоніі», прысвечанае 120-годдзю з дня нараджэння Максіма Багдановіча – выдатнага беларускага паэта-наватара, цудоўнага перакладчыка, крытыка і публіцыста.

Дадзеныя праекты можна смела назваць персанальнымі мультымедыйнымі энцыклапедыямі на адным электронным носьбіце, які змяшчае ўсю творчую спадчыну пісьменнікаў, шматлікія пераклады на замежныя мовы, вялікі аб’ём інфармацыі аб выданнях і публікацыях, прысвечаных жыццю і творчасці беларускіх классікаў.

Такім чынам, шырокае ўкараненне інфармацыйных тэхналогій уплывае на ўсе сферы грамацкага жыцця, у тым ліку і культуру. Фарміраванне і распаўсюджванне інфармацыйных рэсурсаў культуры разглядаецца як адна з важнейшых умоў культурнага развіцця краіны. Сёння ўжо бясспрэчна неабходнасць у атрыманні інфармацыі, якая аб’ектыўна і поўна адлюстроўвае стан культуры, тэндэнцыі і інавацыі сучаснай культурнай палітыкі. Інфармацыйныя патрэбнасці спецыялістаў галіны культуры, студэнтаў, аспірантаў, а таксама ўсіх тых хто цікавіцца і займаецца вывучэннем культуры, патрабуюць пастаяннай падтрымкі, фарміравання інфармацыйнай базы навуковай, адукацыйнай і творчай дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Спіс выкарыстанай літаратуры:

1. Горбачева, Л. В. Информационные потребности специалистов социокультурной сферы: некоторые подходы и технологии к выявлению и обеспечению / Л. В. Горбачева // Современные информационные технологии в Национальной библиотеке Беларуси : сборник статей / [составитель А. А. Шереметьева ; редколлегия: Л. Г. Кирюхина и др.]. – Минск, 2008. – С. 92–105
2. Кузьминич, Т. В. Фактографические базы данных Национальной библиотеки Беларуси – источник информации о национальных объектах / Т. В. Кузьминич // Бібліятэчны веснік : [зборнік артыкулаў] / Нацыянальная бібліятэка Беларусі ; [рэдкалегія: Р. С. Матульскі (старшыня) і інш.]. – Мінск, 2010. – Вып. 2. – С. 158–166.
3. Суминова, Т. Н. Специфика и морфология информационных ресурсов художественной культуры / Т.Н. Суминова // Вестник Московского государственного университета культуры и искусств. – 2005. – № 4. – С. 25–28.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ